# ВОДГУК

на работу вучаніцы 11 класа
ДУА «Гаранская дзіцячы сад-сярэдняя школа Полацкага раёна»
Н. Кісялёвай «Вобраз Радзімы ў зборніку вершаў Надзеі Салодкай
“Месца пад сонцам”»

Тэма даследавання Н. Кісялёвай «Вобраз Радзімы ў зборніку вершаў Надзеі Салодкай “Месца пад сонцам”» мае актуальнае патрыятычнае гучанне.

Ва ўводзінах Н. Кісялёва сфармулявала мэты і задачы, вызначыла прадмет і аб’ект даследавання. Асноўны змест работы ўключае два раздзелы («Творчая індывідуальнасць Надзеі Салодкай» і «Вобраз Радзімы ў зборніку вершаў Надзеі Салодкай»). Работа таксама ўтрымлівае заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры і дадатак. Агульны памер работы без дадатку — 18 старонак.

Дадзеная работа падрыхтавана для ўдзелу ў краязнаўчых чытаннях «Спадчына Полацкай зямлі», і было б лагічным акцэнтаваць увагу найперш на краязнаўчым аспекце даследавання, напрыклад, разгледзіць адлюстраванне вобразу *малой Радзімы* ў творчасці Надзеі Салодкай, тым больш, што паэтычны матэрыял дае нам такую магчымасць. Надзея Стэфанаўна Салодкая, Ганаровы грамадзянін Полацка, вялікая патрыётка Полаччыны, і пачуццё Радзіма вынікае ў яе перадусім з перажываняў палачанкі.

У рабоце адсутнічае выразнае абгрунтаванне крытэрыяў выбару зборніка «Месца пад сонцам» для разгляду. Чаму менавіта гэтая кніга, чаму толькі адзін паэтычны зборнік Надзеі Салодкай прыцягнуў увагу аўтара работы? Магчыма, было б карысным разгледзіць дадзены зборнік у кантэксце ўсёй творчасці паэткі.

Адной з задач дадзенага даследавання, як вынікае з уводзінаў, з’яўляецца аналіз станаўлення творчай індывідуальнасці паэткі, выяўленне ўплыву жыццёвых акалічнасцяў на паэтычную творчасць Надзеі Салодкай. На вырашэнне дадзенай задачы ў рабоце адведзена толькі адна няпоўная старонка. Дзіўна было б спадзявацца вырашыць падобную досыць складаную задачу, абмежаваўшыся такім сціслым аб’ёмам тэксту. Дадзеная задача даследавання засталася нераскрытай. Калі ў аўтара работы не хапала матэрыялу, трэба было ў такім выпадку перафармуляваць задачу, зрабіць яе больш сціплай.

У цэлым работа Н. Кісялёвай «Вобраз Радзімы ў зборніку вершаў Надзеі Салодкай “Месца пад сонцам”» выканана на належным узроўні.

16.12.2014

к. гіст. н., дацэнт
кафедры гісторыі і турызму
УА «ПДУ» С.А. Шыдлоўскі